ПАДЗЕЯ

# ГУЧЫЦЬ, ЛЯЦІЦЬ КУПАЛАЎ ГОЛАС НАД ГЭТАЙ ВЕЧНАЮ ЗЯМЛЁЙ…

**У Гродне адзначылі 140-ю гадавіну з дня нараджэння Янкі Купалы.**



7 ліпеня Беларусь адсвяткавала 140-ю гадавіну з дня нараджэння Янкі Купалы. У мястэчку Вязынка (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобласці) у 1882 годзе менавіта ў гэты дзень з'явіўся на свет класік беларускай літаратуры, Народны паэт Беларусі Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч). Па ўсёй Беларусі, ва ўсіх яе кутках у гэты дзень успаміналі нашага дарагога Песняра.

У Гродзенскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці доўгія гады дзейнічае Народны клуб творчай інтэлігенцыі «Грані», якім кіруе аўтар і выканаўца песень Аляксандр Міхайлавіч Закрэўскі. З нагоды юбілея Янкі Купалы 7 ліпеня тут сабраліся літаратары і літаратуразнаўцы, прыхільнікі Купалавага слова, прадстаўнікі грамадскасці. Сабраліся, каб аддаць даніну пашаны славутаму майстру, каб падзяліцца думкамі аб тым, што значыць сёння Янка Купала, яго жыццё і яго літаратурная спадчына для кожнага з нас. Размова атрымалася змястоўнай і вельмі шчырай, закранула наша грамадзянскае сумленне, скалынула пачуццёвасць людзей, неабыякавых да лёсу нашай Радзімы. Галоўная думка мерапрыемства - у кожнага свой Купала, але яго вобраз здольны ўсіх нас, такіх розных, не толькі натхніць, але і аб'яднаць. Пакуль мы памятаем яго, чытаем яго творы, вывучаем яго думкі, бліжэй пазнаем рысы яго постаці, у нашай сінявокай Беларусі ёсць будучыня і будучыня гэтая светлая, як чыстае ліпеньскае неба.

Ад Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ў музычна-паэтычнай вечарыне «Гучыць, ляціць Купалаў голас над гэтай вечнаю зямлёй…» прынялі ўдзел беларускі паэт Браніслаў Ермашкевіч і кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, які, дарэчы, з гонарам носіць імя Янкі Купалы, літаратуразнаўца Аліна Сабуць. Браніслаў Іосіфавіч прачытаў некалькі лірычных прысвячэнняў вобразу Я. Купалы і падарыў педагогам ды студэнтам галоўнай ВНУ Прынёмання рарытэтнае выданне Купалаўскага зборніка «Жалейка» з уласнай бібліятэкі. Аліна Эдмундаўна вельмі пранікнёна і вобразна падзялілася сваімі думкамі аб розных творах і розных этапах

творчасці паэта. Таксама ў імпрэзе ўзяла ўдзел былы выкладчык ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратуразнаўца, паэтэса, перакладчык Ала Петрушкевіч (псеўданім Альжбета Кеда). Прамова выступоўцы была прасякнута шчымлівымі нотамі жальбы аб сябрах і аднадумцах, якія пайшлі з жыцця. Прагучалі імёны даследчыка творчасці Я. Купалы Ігара Васільевіча Жука (1957-2017) і прафесара-мастацтвазнаўца Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча (1931-2022). У выкананні Аляксандра Закрэўскага прагучалі песні пад гітару на словы Янкі Купалы, Яўгеніі Янішчыц і на ўласныя словы (музыка А. Закрэўскага). На мерапрыемстве прысутнічаў ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы дзіцячы паэт Віктар Сямёнавіч Кудлачоў. Завяршылася музычна-паэтычная вечарына, прысвечаная 140-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы, рубрыкай «Свабодны мікрафон» і сумесным фатаграфаваннем.

***ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА***

***На здымках:*** эпізоды і ўдзельнікі музычна-паэтычнай вечарыны «Гучыць, ляціць Купалаў голас над гэтай вечнаю зямлёй…», прысвечанай 140-годдзю з дня нараджэння Народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. 7 ліпеня 2022 года.

***[Яшчэ пра падзею]()***













Выступаюць Браніслаў Ермашкевіч, Аляксандр Закрэўскі, Ала Петрушкевіч, Аліна Сабуць. Рубрыка «Свабодны мікрафон».

